**Выбары*2024. Аналітычная справаздача па выніках назірання за перадвыбарнай агітацыяй**

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*[1]2024 арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі па адкрытых крыніцах і паведамленнях ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

- этап агітацыі, як і агулам выбарчая кампанія, праходзіў ва ўмовах зачышчэння публічнай палітычнай прасторы: пасля перарэгістрацыі засталіся 4 палітычныя партыі з 16, ліквідаваныя сотні арганізацый грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ, пераследуюцца актывісты і журналісты, абмяжоўваецца доступ да інфармацыі ўнутры краіны. У гэтых умовах не адбываецца рэальнае абмеркаванне палітычных і грамадска-значных пытанняў. Асноўнай, а для асобных груп насельніцтва — адзінай, крыніцай інфармацыі аб палітычным працэсе застаюцца дзяржаўныя СМІ;
- цалкам кантраляваны ўладамі выбарчы працэс, што пачаўся з утварэння выбарчых камісій[2] і фармавання спісаў кандыдатаў[3] (гл.папярэднія справаздачы кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"), працягнуўся жорстка кантраляванай імітацыяй палітычнай барацьбы паміж спрэс праўладнымі кандыдатамі. Улады вырашалі складаную задачу стварэння карціны грамадскай цікавасці да выбараў* ва ўмовах забароны праявы любой грамадскай ініцыятывы;

---

[1] Для мэтаў дакументаў кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" тэрмін "выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі–2024 выкарыстоўваецца з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, бо любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.

[2] https://elections2024.spring96.org/be/news/113679

[3] https://elections2024.spring96.org/be/news/114270

- Выбарчы кодэкс (ВК) прадугледжвае магчымасць правядзення масавых мерапрыемстваў з удзелам кандыдатаў,[4] але ўлады, якія разглядаюць любую вулічную актыўнасць як пагрозу, распачалі ўсе меры, каб такія мерапрыемствы былі нябачныя. У параўнанні з мінулымі выбарчымі кампаніямі скарацілася колькасць месцаў, дзе такія мерапрыемствы можна праводзіць. Тыя рэдкія перадвыбарчыя пікеты, што праводзіліся па краіне, былі малалікімі і аформленымі дзяржаўнай атрыбутыкай, таму было складана вызначыць, у падтрымку якога кандыдата яны праводзіліся;
- агітацыйная кампанія большасці кандыдатаў вялася пераважна ў форме сустрэч з выбаршчыкамі ў актавых залах устаноў і прадпрыемстваў, часцяком у працоўны або абедзенны час. Удзел выбаршчыкаў у такіх сустрэчах забяспечваўся адміністрацыйна. Інфармацыйнае асвятленне такіх сустрэч стварала бачнасць вялікай цікавасці да кандыдатаў, іх праграмах і адказах на пытанні, якія цікавяць выбаршчыкаў. Адміністрацыйная кіравальнасць працэсаў агітацыі прыкметная ў своеасаблівай практыцы “эканоміі” арганізацыйных намаганняў: распаўсюджанымі былі сумесныя выступы некалькіх кандыдатаў, зарэгістраваных па адной выбарчай акрузе, з практычна ідэнтычнымі праграмамі, што з'яўляецца нонсэнсам у канкурэнтнай выбарчай кампаніі;
- на некаторых з сустрэч з выбаршчыкамі прысутнічалі прадстаўнікі МУС, якія ведалі асобы прысутных, што стварала адчуванне небяспекі і прыводзіла да дадатковага самацэнзуравання па непажаданых пытаннях аб сітуацыі ў краіне;
- паводле прадстаўленых ЦВК дадзеных, па стане на 4 лютага 2024 г. (на 24 лютага на сайце ЦВК адсутнічаюць пазнейшыя дадзеныя) правам падаць сваю праграму для апублікавання ў друкаваных СМІ скарысталіся 82% кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў. Знайсці тэксты праграм кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў у Інтэрнэце цяжка: іх не публікуюць ні сайты дзяржаўных СМІ, ні самі кандыдаты, ні партыі, якія вылучылі іх. Перадвыбарчыя праграмы кандыдатаў агулам адлюстроўваюць выпусташаны палітычны ландшафт краіны (некаторыя з іх фактычна слова ў слова паўтараюць адзін аднаго) і ўяўляюць сабой — незалежна ад партыйнасці — набор каштоўнасцяў, супадальных з тымі, якія дэкларуюць дзейныя ўлады;
- кандыдатам быў прадастаўлены эфірны час на дзяржаўным тэлебачанні, фармальна праводзіліся тэледэбаты. Аднак існуючыя заканадаўчыя абмежаванні за вылікам уступнага і заключнага слова пакідаюць кожнаму кандыдату каля 3 хвілін на камунікацыю з апанентам, што абмяжоўвае магчымасць паўнавартаснага абмену думкамі. Некаторыя выступы

[4] "Кандыдат" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары

ўтрымлівалі прыкметы распальвання варожасці, забароненай арт. 47 ВК, і маніпулявання інфармацыяй;

- найбольш яскрава штучны характар перыяду агітацыі бачны праз асвятленне гэтага этапу ў дзяржаўных СМІ. Пры агульнай шчыльнасці інфармавання, яно адлюстроўвае не канкурэнтную палітычную барацьбу альтэрнатыўных бачанняў будучыні краіны, а агульныя словы пра важнасць выбараў і пра абавязак выбаршчыкаў узяць удзел у выбарах (з акцэнтам на датэрміновым галасаванні, які захоўваецца);
- ЦВК, выканкамы, установы сацыяльнай сферы былі актыўна ўцягнутыя ў адукацыйна-асветніцкія мерапрыемствы пра выбары, падмяняючы такой актыўнасцю жывы палітычны працэс перадвыбарнай барацьбы. Асаблівая ўвага ў агітацыйны перыяд пры правядзенні розных “дыялогавых пляцовак” і “адкрытых дыялогаў” ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі і пры іх асвятленні ў сацыяльных сетках і СМІ надавалася “патрыятычнаму выхаванню моладзі”. Пры гэтым удзельнікі такіх інфармацыйных мерапрыемстваў часта знаходзіліся ў залежным ад выступоўцаў становішчы і яўка на такія мерапрыемствы для іх магла быць фактычна абавязковай;
- многія зарэгістраваныя кандыдаты не карысталіся сваім правам адкрываць спецыяльныя выбарчыя рахункі: на ўзроўні выбараў* у Палату прадстаўнікоў толькі 160 кандыдатаў з 265 скарысталіся гэтай магчымасцю. Гэта азначае, што па ўсёй краіне 105 кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў “праводзяць” кампанію, не маючы на яе сродкаў. Гэта даказвае імітацыйны характар канкурэнтнасці на выбарах*.

## ПРАВАВАЯ БАЗА

Артыкул 155 ВК дае вызначэнне перадвыбарнай агітацыі: “дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў перыяд выбарчай кампаніі і мае мэту заахвоціць альбо тая, якая заахвочвае выбаршчыкаў галасаваць альбо не галасаваць за кандыдата, кандыдатаў або галасаваць супраць усіх кандыдатаў”. Па сэнсе гэтай нормы да перадвыбарчай агітацыі адносіцца не толькі дзейнасць па ініцыяванню прамога кантакту з выбаршчыкамі, але і з мэтай заахвоціць іх да галасавання пэўным чынам.[5]

Парадак правядзення перадвыбарчай агітацыі рэгулюецца главой 10 Выбарчага кодэкса (арт. 45-47) і пастановамі ЦВК.

Арт. 45 ВК надзяляе грамадзян, палітычныя партыі, грамадскія аб’яднанні, працоўныя калектывы правам свабоднага і ўсебаковага абмеркавання:

---

[5] Merriam-Webster, "canvassing"

- перадвыбарчых праграм кандыдатаў у дэпутаты;
- палітычных, дзелавых і асабістых якасцяў кандыдатаў у дэпутаты;
- правядзення агітацыі за або супраць кандадытаў на сходах, мітынгах, у сродках масавай інфармацыі, падчас сустрэч з выбаршчыкамі;
- праводзіць агітацыю за або супраць кандыдатаў ў Інтэрнэце.

ВК у рэд. ад 04.02.2023 вызначае цяпер і пачатак перадвыбарчай агітацыі кандыдатаў у Прэзідэнты і дэпутаты: пачынаецца не раней, чым за 25 дзён да выбараў і заканчваецца ў 24 гадзіны дня, які папярэднічае дню выбараў.

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства не маюць права ўдзельнічаць у агітацыі. Таксама забараняецца агітацыя, пры правядзенні якой ажыццяўляецца:

- прапаганда вайны, утрымліваюцца заклікі да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу;
- абразы і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у дэпутаты;
- заклікі, якія падахвочваюць або маюць сваёй мэтай падахвочванне да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, назначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і інш (арт. 47 ВК).

Формы правядзення агітацыі замацаваныя ў арт. 45 ВК: сустрэчы з выбаршчыкамі, выробленне і распаўсюд агітацыйных матэрыялаў, правядзенне масавых мерапрыемстваў, а таксама іншыя формы, якія зручныя выбаршчыкам – такім чынам, спіс формаў перадвыбарчай агітацыі адкрыты.

**Сустрэчы з выбаршчыкамі**

Сустрэчы з выбаршчыкамі могуць праходзіць у выглядзе сходаў альбо ў іншай зручнай для выбаршчыкаў форме.

Мясцовыя выканкамы спрыяюць правядзенню такіх сустрэч; вызначаюць памяшканні для правядзення сустрэч кандыдатаў у дэпутаты з выбаршчыкамі, а таксама для перадвыбарчых сходаў, якія арганізуюцца выбаршчыкамі.

Заявы аб прадастаўленні памяшканняў падаюцца кандыдатамі, даверанымі асобамі кандыдатаў і выбаршчыкамі не пазней, чым за два дні да запланаванай даты правядзення мерапрыемства.

Памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі, перадвыбарчых сходаў прадстаўляюцца бясплатна ў парадку чарговасці паступлення заяў.

Кандыдаты ў дэпутаты маюць права за кошт сродкаў выбарчага фонду арандаваць для гэтых мэтаў будынкі і памяшканні, якія прадстаўляюцца кандыдатам на роўных умовах.

Сустрэчы з выбаршчыкамі могуць быць арганізаваныя некалькімі кандыдатамі для правядзення сумесных сустрэч.

**Распаўсюд агітыцыйных матэрыялаў**

Мясцовыя выканкамы вызначаюць месцы для размяшчэння друкаваных агітацыйных матэрыялаў.

Агітацыйныя матэрыялы мусяць адпавядаць наступным патрабаванням:

- Выраблены на тэрыторыі Беларусі;
- За кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў;
- Мусяць змяшчаць найменне і адрас арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), якая вырабіла агітацыйныя друкаваныя матэрыялы, нумар пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі вытворцы друкаваных выданняў і дату яго выдачы, тыраж і нумар замовы, прозвішча і ініцыялы замоўцы.

**Парадак распаўсюду агітацыйных матэрыялаў:**

Адзін экзэмпляр агітацыйных друкаваных матэрыялаў або іх копіі (зменшаныя копіі, макеты і да т.п.) да распаўсюджвання прадстаўляюцца кандыдатам у дэпутаты ў тэрытарыяльную, акруговую выбарчую камісію;

Забараняецца распаўсюджванне ананімных агітацыйных друкаваных матэрыялаў;

Забараняецца размяшчаць агітацыйныя друкаваныя матэрыялы ў будынках, у якіх размешчаны камісіі, і ў памяшканнях для галасавання;

Размяшчэнне агітацыйных друкаваных матэрыялаў у іншых месцах можа ажыццяўляцца з дазволу кіраўніка адпаведнай арганізацыі. У выпадку, калі кіраўнік арганізацыі дазволіў размяшчэнне ў арганізацыі агітацыйнага друкаванага матэрыялу аднаму кандыдату, ён не мае права адмовіць іншаму кандыдату ў размяшчэнні агітацыйнага друкаванага матэрыялу на тых жа ўмовах;

Выканкамы могуць забараняць размяшчэнне агітацыйных друкаваных матэрыялаў у не адведзеных для іх месцах;

Не дапускаюцца зняцце, заклейванне, замазванне, пашкоджанне агітацыйных друкаваных матэрыялаў, калі яны выраблены і размешчаны з захаваннем патрабаванняў заканадаўства.

### Масавыя мерапрыемствы

Мэтай масавых мерапрыемстваў мусіць быць перадвыбарчая агітацыя. Для арганізацыі масавых мерапрыемстваў кандыдаты ў дэпутаты і давераныя асобы кандыдатаў накіроўваюць пісьмовае апавяшчэнне ў мясцовыя выканкамы не пазней, чым за два дні да запланаванай даты правядзення мерапрыемства. Парадак правядзення масавых мерапрыемстваў рэгулюецца законам “Аб масавых мерапрыемствах”.

### Перадвыбарчая агітацыя праз СМІ

У рэдакцыі ад 04.03.2023 з ВК прыбрана фармальнае замацаванне, што кандыдаты ў дэпутаты з часу іх рэгістрацыі на роўных правах карыстаюцца дзяржаўнымі СМІ. Цяпер гэта толькі абавязак дзяржаўных СМІ забяспечваць роўныя магчымасці для перадвыбарчых выступаў кандыдатаў, апублікавання праграм кандыдатаў і агітацыі.

Пастановай ЦВК ад 23 студзеня 2023 г. № 3[6] зацверджаны графік размеркавання эфірнага часу для бясплатных выступаў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання па тэлебачанні і радыё.

ЦВК апублікавала пастанову № 35[7] аб парадку выкарыстання СМІ пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў*. Гэты акт капіюе і дэталізуе палажэнні ВК, што рэгулююць агітацыю ў СМІ, удакладняе патрабаванні да перадвыбарных праграмаў. З улікам апошніх зменаў, выбарчае заканадаўства дае кандыдатам наступныя магчымасці:

кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў:

- бясплатная публікацыя перадвыбарнай праграмы ў адной з буйных газет[8] або ў некалькіх рэгіянальных газетах, якія выпускаюцца ў межах адной акругі[9],

---

[6] Пастанова ЦВК Рэспублікі Беларусь ад 23 студзеня 2024 г. № 3: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post3-2024.pdf

[7] Пастанова Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь 21 лістапада 2023 г. № 35: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post35.pdf

[8] «Звязда», «Рэспубліка», «Заря», «Витебские вести», «Гомельская праўда», «Гродзенская праўда», «Мінская праўда», «Магілёўскія ведамасці», «Вечерний Минск».

[9] Пастанова ЦВК № 35, п.1, 3.

- адно бясплатнае выступленне па тэлебачанні і адно бясплатнае выступленне па радыё — не больш за пяць хвілін кожнае (эфірны час паміж кандыдатамі размяркоўваецца з дапамогай лёсавання і прадастаўляецца з 19.00 да 20.00 (для тэлебачання) або з 6.45 да 8.00 (для радыё) па працоўных днях),
- магчымасць узяць удзел у тэледэбатах для кандыдатаў, якія балатуюцца ў адной акрузе (пры гэтым кожнаму кандыдату адводзіцца не больш за 5 хвілін эфірнага часу, дэбаты транслююцца ў запісе),
- дадатковы эфірны час па радыё і тэлебачанні, апублікаванне ў друкаваных СМІ і на інтэрнэт-рэсурсах за кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў кандыдатаў.
- кандыдатам у мясцовыя Саветы дэпутатаў:
- бясплатнае размяшчэнне перадвыбарнай праграмы на сайце мясцовага выканаўчага і распарадчага органа,
- дадатковы эфірны час у радыёпраграмах, апублікаванне ў друкаваных СМІ і на інтэрнэт-рэсурсах за кошт сродкаў уласных выбарчых фондаў кандыдатаў.

## УМОВЫ АГІТАЦЫІ

### 1. Агітацыя ў СМІ

Этап агітацыі праходзіў ва ўмовах зачысткі і пастаяннага пераследу незалежных СМІ і асобных журналістаў,[10] абмежавання доступу да інфармацыі ўнутры краіны.[11] У гэтых умовах асноўнай, а для асобных груп насельніцтва — адзінай крыніцай інфармацыі аб палітычным працэсе застаюцца дзяржаўныя СМІ.

У частцы забеспячэння кандыдатам доступу да СМІ для агітацыі можна адзначыць наступнае:

- Друкаваныя дзяржаўныя СМІ давалі кандыдатам магчымасць апублікаваць свае праграмы. Пры гэтым электронныя версіі тых жа СМІ праграмы не дублявалі. Такім чынам, выявіць тэксты праграм кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў у Інтэрнэце цяжка: іх не публікуюць ні дзяржаўныя СМІ, ні самі кандыдаты, ні партыі,[12] якія

[10] Гл. графу "Рэпрэсіі ў 2024 г.": https://baj.media/be/analytics/represii-suprac-zhurnalistau-i-medyya-u2024-godze-spis-znyavolenyh

[11] Сайт і сацсеткі чарговага не праўладнага СМІ – медыярэсурсу "Настоящее время" – былі прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі https://www.svoboda.org/a/v-belarusi-priznali-ekstremistskimisayt-i-sotsseti-nastoyaschego-vremeni-/32770625.html

[12] Такія аб'яднанні пераважна публікуюць толькі агульную праграму партыі і заклік узяць удзел у выбарах, без недвухсэнсоўнай падтрымкі канкрэтных кандыдатаў (напрыклад, гл. сайт Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці https://rpts.by/en, Ліберальна-дэмакратычнай партыі https://ldpb.by/ru/, Камуністычнай партыі http://www.comparty.by/)

вылучылі іх. Праграмы кандыдатаў у асобныя мясцовыя Саветы дэпутатаў не былі апублікаваныя належным чынам на сайтах адпаведных выканкамаў: так, на сайце Гомельскага аблвыканкама адсутнічаюць праграмы 32% вылучэнцаў,[13] на сайце Гродзенскага аблвыканкама — 50%,[14] Гродзенскага гарвыканкама — 46%.[15]
- Паводле дадзеных ЦВК, па стане на 4 лютага 2024 года правам падаць сваю праграму для апублікавання ў друкаваных СМІ скарысталіся 82% кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў (218 чалавек з 265 зарэгістраваных).[16]
- Вядомыя выпадкі пачатку агітацыі ў СМІ да ўстаноўленага тэрміну.[17]
- Пры фактычнай адсутнасці дакладнай інфармацыі аб праграмах асобных кандыдатаў, дзяржаўныя СМІ розных узроўняў актыўна асвятлялі дзейнасць асобных кандыдатаў, часцяком не паказваючы, што асоба, якой прысвечаны матэрыял, вылучаецца ў дэпутаты.[18]
- Кандыдатам быў прадастаўлены эфірны час на дзяржаўным тэлебачанні, праводзіліся тэледэбаты. Існуючыя заканадаўчыя абмежаванні за выключэннем уступнага і заключнага слова пакідаюць кожнаму кандыдату каля 3 хвілін на камунікацыю з апанентам, што абмяжоўвае магчымасць паўнавартаснага абмену думкамі. Некаторыя выступы ўтрымлівалі прыкметы распальвання варожасці,[19] забароненай арт. 47 ВК, і маніпулявання інфармацыяй.[20]

Перадвыбарчыя праграмы кандыдатаў агулам адлюстроўваюць выпусташаны палітычны ландшафт краіны (некаторыя з іх фактычна слова ў слова

[13] https://gomel-region.by/ru/pp25-ru/
[14] https://grodno-region.by/ru/programmy_kandidatov-ru
[15] http://grodno.gov.by/main.aspx?guid=20181
[16] 218 чалавек з 265 зарэгістраваных: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/pr-prog-2024.pdf
[17] https://elections2024.spring96.org/ru/news/114072, https://grodnonews.by/news/vlast/predsedatel_grodnenskogo_oblsoveta_elena_pasyuta_molodezh_u_nas_zamechatelnaya_no_ryadom_dolzhny_byt_opytnye_nastavniki.html
[18] Гл. матэрыялы, прысвечаныя кандыдатцы ў дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета Алене Пасюце: https://grodnonews.by/news/vlast/v_grgmu_proshla_dialogovaya_ploshchadka_s_uchastiem_predsedatelya_oblastnogo_soveta_deputatov_eleny_vasilevny_pasyuty.html, https://grodnonews.by/news/vlast/golosuyu_za_mir_i_spokoystvie_v_nashey_strane_predsedatel_grodnenskogo_oblastnogo_soveta_deputatov_elena_pasyuta_prinyala_uchastie_v_dosrochnom_goloso.html, https://grodnonews.by/news/lifestyle/intervyu_s_predsedatelem_grodnenskogo_oblsoveta_i_prazdnovanie_rozhdestvenskogo_sochelnika_glavnoe_za_6_yanvarya.html; Людміле Кананові́ч — кандыдатцы ў дэпутаты Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў: https://mgazeta.by/sotsium/item/20283-v-prioritete-opytobrazovanie-sfera-deyatelnosti.html: https://mgazeta.by/regionalnyj-aktsent/item/19981-lyudmila-kananovichvstretilas-s-kollektivami-organizatsij-i-molodymi-izbiratelyami.html, https://mgazeta.by/regionalnyjaktsent/item/19816-molodechnenskij-psikhonevrologicheskij-dom-internat-dlya-prestarelykh-i-invalidovposetili-pavel-gubko-i-lyudmila-kananovich.html, https://mgazeta.by/regionalnyj-aktsent/item/19712-lyudmilakananovich-provela-pryamuyu-telefonnuyu-liniyu-i-prinyala-uchastie-v-aktsii-nashi-deti.html
[19] Прыклад выкарыстання мовы варожасці ў дачыненні да беларусаў, якія пакінулі краіну, у выступе кандыдата Андрэя Паўленкі: https://www.youtube.com/watch?v=kzO3B_Qv35Y
[20] https://nashaniva.com/336603

паўтараюць адзін аднаго)[21] і ўяўляюць сабой — у незалежнасці ад партыйнасці — набор каштоўнасцяў, што супадаюць з тымі, якія дэкларуюць улады: пераважная большасць кандыдатаў выступае за захаванне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай бяспекі, абарону “гістарычнай праўды”, падтрымку традыцыйных каштоўнасцяў, інстытута сям'і і таленавітай моладзі, неабходнасць сацыяльнай падтрымкі, даступнасць і высокую якасць адукацыі, развіццё эканомікі.[22] У праграмах адсутнічаюць тэзісы, якія маглі б успрымацца як крытыка існуючага курсу ў якім-небудзь значным аспекце.

Асвятленне этапу агітацыі ў дзяржаўных СМІ пры агульнай шчыльнасці інфармавання таксама адлюстроўвае не канкурэнтную палітычную барацьбу альтэрнатыўных бачанняў будучыні краіны, а абавязак выбаршчыкаў узяць удзел у выбарах (з захаваннем акцэнта на датэрміновым галасаванні)[23] — пры адсутнасці ў апошніх магчымасці атрымліваць дастатковую інфармацыю пра кандыдатаў з розных крыніц. Нават публікацыі, накіраваныя на падагрэў цікавасці да барацьбы кандыдатаў, факусуюцца не на адрозненнях у праграмах кандыдатаў, а на службовым становішчы апошніх.[24]

## 2. Агітацыйныя масавыя мерапрыемствы і сустрэчы з выбаршчыкамі

Мясцовымі выканкамамі былі вызначаны памяшканні для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі. На сайтах мясцовых выканкамаў публікаваліся паведамленні аб правядзенні запланаваных сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі, а таксама графікі правядзення такіх сустрэч. З апублікаваных дакументаў зразумела, што вызначаныя месцы для сустрэч кандыдатаў і выбаршчыкаў кандыдатамі і не планаваліся асабліва да выкарыстання, бо замест іх, сустрэчы былі запланаваныя і фактычна праводзіліся на прадпрыемствах, ва ўстановах адукацыі, інтэрнатах, заводах, сталовых і г.д.

---

[21] Фактычна ідэнтычныя праграмы кандыдатаў Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі: https://nashaniva.com/336068

[22] Нягледзячы на тое, што праграмы кандыдатаў у мясцовыя Саветы пераважна датычацца сацыяльна-эканамічных пытанняў, развіцця інфраструктуры, і гэтак далей, асобныя праграмы таксама адлюстроўваюць накіраванасць на адстойванне нацыянальных інтарэсаў дзяржавы, абарону канстытуцыйнага ладу і незалежнасці: https://spring96.org/be/news/114394

[23] Пры гэтым дзяржаўныя СМІ фактычна не згадваюць, што датэрміновае галасаванне ў беларускім заканадаўстве застаецца нестандартнай формай галасавання для грамадзян, якія не маюць магчымасці прагаласаваць у дзень выбараў (арт. 53 ВК): https://mediaiq.info/volnitelnoe-ozhivlenie-iulybki-na-licah-kak-gosmedia-agitirujut-za-vybory

[24] Напрыклад, публікацыя анлайн-выдання "Віцьбічы" https://www.vitbichi.by/news/obshchestvo/azbuka_vybora_na_vitebshchine_nabirayut_temp_agitatsionnye_meropriyatiya/

Напрыклад, у раскладзе сустрэч кандыдатаў у Полацкі раённы Савет дэпутатаў[25] з выбаршчыкамі большасць месцаў не супадалі з тымі, што вызначылі выканаўчыя камітэты, і часта прызначаліся на працоўны ці абедны час для выбаршчыкаў.

Паведамляецца, што часта сустрэчы кандыдатаў праводзіліся з тымі выбаршчыкамі, чыі працоўныя месцы залежаць ад кандыдатаў.[26] Некаторыя кандыдаты запланавалі сустрэчы ў памяшканнях мясцовых Саветаў дэпутатаў. Напрыклад, старшыня Экіманскага сельвыканкама Скрыган Таццяна запланавала сустрэчу з выбаршчакамі на сваім працоўным месцы а 13.00 – у абедзенны час.[27] Вядома, што некаторыя сустрэчы праводзіліся пад выглядам бацькоўскіх сходаў або працоўных нарад, а таксама як сустрэчы з членамі выбарчых камісій – настаўніцамі ўстаноў адукацыі або культуры, у якіх праходзілі сустрэчы.

Большасць памяшканняў з афіцыйных паведамленняў і СМІ, у якіх фактычна праводзіліся сустрэчы з выбаршчыкамі, мелі рэжымны уваход пад кантролем прадстаўнікоў дэпартамента Аховы МУС Рэспублікі Беларусь. Пры ўваходзе дзяжурныя тэхнічныя работнікі запісвалі усіх, хто ўваходзілі пры прад'яўленні дакумента, які пацвярджае асобу. Падчас сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі панавала атмасфера страху і кантроль над гэтымі працэсамі. З улікам таго, што прадстаўнікам МУС, якія прысутнічалі на некаторых такіх сустрэчах, былі вядомы асобы прысутных, задаваць непажаданыя пытанні наконт сітуацыі ў краіне было небяспечным. Таксама не было зафіксавана выпадкаў, калі такія сустрэчы праводзіліся па ініцыятыве або запыце выбаршчыкаў.

Былі зафіксаваны выпадкі парушэнняў кандыдатамі патрабавання заканадаўства праводзіць агітацыйныя мерапрыемствы не раней, чым за 25 дзён да выбараў (з 31 студзеня па 24 лютага). Так, 29 снежня з выбаршчыкамі сустракаўся дырэктар Крычаўскага музея Уладзімір Мішчанка, які балатуецца ў мясцовы Свает дэпутатаў. Удзел у сустрэчы ў асноўным бралі чальцы ветэранскіх арганізацый.[28]

Месцы, якія мясцовыя выканкамы забаранілі для сустрэч з выбаршчыкамі з’яўляюцца самымі папулярнымі месцамі ў выбаршчыкаў, напрыклад, цэнтральныя плошчы гарадоў, а таксама паблізу (у межах 50 м) спартыўных збудаванняў, будынкаў вайсковых частак, культуры, адукацыі, мясцовых

---

[25] Полацкі раённы выканаўчы камітэт: https://polotsk.vitebsk-region.gov.by/ru/vybory-2024/soobshcheniya-o-provedenii-kandidatami-v-deputaty-vstrech-s-izbiratelyami
[26] На Магілёўшчыне кандыдат у дэпутаты агітуе галасаваць за сябе людзей, чыі працоўныя месцы шмат у чым залежаць ад яго: https://elections2024.spring96.org/be/news/114255
[27] Полацкі раённы выканаўчы камітэт: https://polotsk.vitebsk-region.gov.by/ru/vybory-2024/soobshcheniya-o-provedenii-kandidatami-v-deputaty-vstrech-s-izbiratelyami
[28] ПЦ “Вясна”, тэлеграм-канал: https://t.me/viasna96/23536

органаў улады, органаў унутраных спраў, пракуратур, судоў і КДБ. Як правіла, вызначана было толькі адно месца ў горадзе або ў раёне, дзе дазволена пікетаваць: пляцоўка перад гарадскім палацам культуры ў Маладзечна, скверык на ўскрайку горада ля гарадской лазні № 1 у Вілейцы, стадыён раёна Сельгастэхніка, які знаходзіцца на самых задворках амаль у рысе горада ў Валожыне,[29] парк воінаў-інтэрнацыяналістаў у мікрараёне "Усход" – у Брэсце.[30]

Асаблівай актыўнасці ў звязку з масавымі мерапрыемствамі заўважана не было. Напрыклад, у Магілёве ўвогуле не было заўважана масавых мерапрыемстваў з кандыдатамі за межамі будынкаў. Тыя агітацыйныя пікеты, якія праводзіліся па краіне, часам былі настолькі немасавыя і толькі з дзяржаўнай атрыбутыкай, што складана было вызначыць, за якога кандыдата ён праводзіцца.[31]

Вядома пра некалькі выпадкаў, калі прадстаўнікі праўладнай партыі "Белая Русь" праводзілі агітацыйныя масавыя мерапрыемствы ў падтрымку праўладных кандыдатаў у дэпутаты, якія пры гэтым вылучаліся як "беспартыйныя". Напрыклад, 7 лютага ў гарадскім парку ў падтрымку Мікалая Маратаева агітацыйны пікет правяла "Белая Русь".[32]

Актыўна праводзіліся пікеты з агітацыяй падтрымаць адзіны дзень галасавання, а не за канкрэтных кандыдатаў. Такія пікеты праходзілі не ў дазволеных месцах, а калі іх праводзілі не кандыдаты або іх давераныя асобы[33] – патрабаваўся дазвол на правядзенне такога масавага мерапрыемства, як таго патрабуе Закон "Аб масавых мерапрыемствах".[34]

Такім чынам, агітацыйныя мерапрыемствы прайшлі кулуарна, фармальна і з прыцягненнем адміністратыўнага рэсурсу, а рэальны ўдзел выбаршчыкаў стаўся немагчымым праз цэнзурную палітыку ўладаў і адсутнасці свабоды слова.

## 3. Выраб і распаўсюджванне агітацыйнай друкаванай прадукцыі

[29] Скверык і стадыён на ўскрайках. У Маладзечне, Вілейцы і Валожыне вызначыліся з месцамі агітацыі: https://elections2024.spring96.org/be/news/114030
[30] Брэст: тэрытарыяльнае поле для перадвыбарнай агітацыі істотна паменшылася: https://elections2024.spring96.org/be/news/114289
[31] Напрыклад, у Светлагорску перадвыбарная агітацыя праходзіць пад завесай сакрэтнасці: https://elections2024.spring96.org/be/news/114260
[32] У Калінкавічах агітуюць за кандыдата Маратаева, датычнага да пераследу праваабаронцаў і актывістаў: https://elections2024.spring96.org/be/news/114311
[33] У Жодзіна, Капылі, Уздзе і Дзяржынку агітуюць "падтрымаць адзіны дзень галасавання": https://elections2024.spring96.org/be/news/114443
[34] Абмежаванні, уведзеныя гэтым законам мы лічым неправавымі, бо яны парушаюць міжнародныя абавязкі Беларусі ў дачыненні да свабоды мірных сходаў. Але ж мусім адзначыць, што падчас папярэдніх выбараў непраўладныя кандыдаты сітэматычна пераследваліся праз гэтыя нормы.

Выраб і распаўсюджванне агітацыйнай друкаванай прадукцыі з'яўляецца адной з формаў перадвыбарчай агітацыі. Для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў кандыдаты ў дэпутаты ў мясцовыя выканаўчыя органы вылучылі спецыяльныя месцы.[35] На іх размяшчаюцца ўлёткі з абвяшчэннем даты выбараў і плакаты кандыдатаў. Падобныя друкаваныя матэрыялы разносяцца і ў паштовыя скрыні.

У асноўным, агітацыйныя матэрыялы надрукаваныя ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам,[36] аднак на некаторых плакатах дадзеныя пазначаны не цалкам або адсутнічаюць зусім. Так, у агітацыйным матэрыяле Алега Раманава, кандыдата ў дэпутаты Нацыянальнага сходу па Гродзенскай-Паўночнай выбарчай акрузе № 52, не ўказаны прозвішча і ініцыялы замоўцы. У адным з агітацыйных матэрыялаў Алены Патапавай, кандыдаткі ў дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі па Гродзенскай-Кастрычніцкай выбарчай акрузе № 50, дадзеныя зусім адсутнічаюць.

## 4. Стварэнне і выкарыстанне выбарчых фондаў кандыдатамі ў дэпутаты

У адсутнасць незалежных назіральнікаў і прадстаўнікоў апазіцыйных партый немагчыма ацаніць выкананне кандыдатамі і ўладамі патрабаванне заканадаўства адносна фінансавання выбараў. ЦВК прадаставіў інфармацыю аб спецыяльных выбарчых рахунках для фармавання выбарчага фонду асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты, адкрытых у Беларусбанку.[37] Для кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў указана інфармацыя толькі аб 160 спецыяльных рахунках.

| | Адкрыта рахункаў | Агулам кандыдатаў зарэгістравана | Акругаў |
|---|---|---|---|
| Мінск | 43 | 59 | 20 |
| Мінская вобласць | 20 | 35 | 17 |
| Брэсцкая вобласць | 28 | 34 | 16 |
| Гомельская вобласць | 23 | 43 | 17 |
| Гродзенская вобласць | 11 | 35 | 13 |
| Магілёўская вобласць | 19 | 26 | 13 |
| Віцебская вобласць | 16 | 33 | 14 |
| агулам | 160 | 265 | 110 |

[35] Гл. Рашэнне Лідскага раённага выканаўчага камітэта ад 10.01.2024 г. № 19, п. 1 https://lida.gov.by/ru/edinyj-den-golosovanija-ru, дадатак 1 да Рашэння Капыльскага раённага выканаўчага камітэта ад 9.01.2024 г. № 25 https://www.kopyl.gov.by/data/files/2024/1kv_2024/10-01-24-37.pdf
[36] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, частка 12 артыкул 45 https://etalonline.by/document/?regnum=hk0000370
[37] https://belarusbank.by/ru/33139/41509/41530

Характэрна, што ў Гродзенскай вобласці ў амаль палове (6 з 13) акругаў ні ў аднаго кандыдата няма выбарчага фонду:

- Гродзенская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 50
- Гродзенская-Ленінская выбарчая акруга № 51
- Іўеўская выбарчая акруга № 54
- Замкавая выбарчая акруга № 57
- Слонімская выбарчая акруга № 58
- Смаргонская выбарчая акруга № 59.

Па ўсёй краіне 105 кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў “праводзяць” кампанію, не маючы на яе сродкаў. Гэта доказвае імітацыйны характар канкурэнтнасці на выбарах*.

Для ацэнкі фінансавых магчымасцяў весці актыўную агітацыйную кампанію, можна даць прыклад найбольш фінансава-паспяховага рэгіёну: горада Мінска. Па дадзеных Мінскага гарвыканкама на 22 лютага 2024 г.[38] Сумы на спецыяльных рахунках кандыдатаў вар'іраваліся ад 80 руб. (22.87 еўра па курсе Нацбанка)[39] да 3 166.8 руб. (905.55 еўра). Сярэдняя сума на рахунках склала 785.9 руб. (224.72 еўра). Пры гэтым на 22 лютага кандыдатамі выдаткавана ў сярэднім 676.51 руб. (193.44 еўра).

## ЗЛОЎЖЫВАННЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫМ РЭСУРСАМ

Этап агітацыі, нароўні з іншымі этапамі выбарчай кампаніі, характарызуецца актыўнымі злоўжываннямі адміністрацыйным рэсурсам. Большасць зарэгістраваных кандыдатаў як у Палату прадстаўнікоў, так і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў – кіраўнікі арганізацый або чыноўнікі,[40] а гэта азначае, што яны валодаюць адміністрацыйным рэсурсам. У гэтым выпадку адміністрацыйны рэсурс выкарыстоўваецца не толькі як незаконны[41] спосаб атрымання канкурэнтнай перавагі ў передвыбарнай гонцы кандыдатаў, але і шмат у чым як інструмент стварэння ілюзіі передвыбарнай актыўнасці кандыдатаў у дэпутаты і грамадства.

Так, значная доля “агітацыйных” матэрыялаў у СМІ, па факце не агітавала за канкрэтных кандыдатаў у дэпутаты, а распавядала пра важнасць узяць удзел у выбарах*.[42] Палітычныя партыі і праўладныя грамадскія аб'яднанні

[38] https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/edinyj_den_golosovanija/info_summa_mgsd_1.shtml
[39] https://myfin.by/bank/kursy_valjut_nbrb/22-02-2022
[40] Гл. https://elections2024.spring96.org/ru/news/114329
[41] Артыкул 73 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь забараняе кандыдатам у дэпутаты выкарыстоўваць перавагі свайго службовага становішча, гэта значыць па сутнасці – злоўжываць адміністрацыйным рэсурсам.
[42] Гл. https://spring96.org/be/news/114316

ўдзельнічалі ў агітацыі за кандыдатаў незалежна ад іх афіляванасці.[43] Распаўсюджанай практыкай былі сумесныя выступленні некалькіх кандыдатаў, зарэгістраваных па адной выбарчай акрузе, у тым ліку кандыдатаў у дэпутаты аднаго ўзроўню па адной акрузе (г. зн. супернікаў).[44]

Агулам адзначаецца, што ў параўнанні з папярэднімі выбарчымі кампаніямі, павялічылася колькасць ідэалагічных ды інфармацыйна-асветніцкіх мерапрыемстваў для моладзі па тэме выбараў. Службовыя асобы, карыстаючыся адміністрацыйным рэсурсам, у агітацыйны перыяд актыўна ўдзельнічалі ў розных "дыялогавых пляцоўках" і "адкрытых дыялогах" ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.[45] Пры гэтым, улічваючы агульны рэпрэсіўны фон[46] выбараў*2024 і аднатыпныя перадвыбарныя праграмы, такія публічныя самапрэзентацыі не з'яўляюцца часткай паўнавартаснай канкурэнтнай барацьбы кандыдатаў. Як самі кандыдаты, так і ўлады або праўладныя СМІ "агітуюць" хутчэй за ўдзел выбаршчыкаў у выбарах* наогул, чым за канкрэтную праграму канкрэтных кандыдатаў. Тым не менш, гэтыя заклікі можна аднесці да злоўжыванняў, паколькі ўдзельнікі такіх інфармацыйных мерапрыемстваў часта знаходзяцца ў залежным ад выступоўцаў становішчы і яўка на такія мерапрыемствы для іх можа быць фактычна абавязковай. У шэрагу выпадкаў пад інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы па тэме выбараў былі завуаляваныя агітацыйныя сустрэчы.[47]

Назіралася практыка ўдзелу службовых асоб, зарэгістраваных кандыдатамі, у інфармацыйна-асветніцкіх сустрэчах па тэме выбараў з працоўнымі калектывамі дзяржаўных арганізацый і прадпрыемстваў.[48]

Сярод злоўжыванняў традыцыйнымі таксама застаюцца правядзенне сустрэч з выбаршчыкамі працоўных калектываў у працоўны час,[49] правядзенне сустрэч з працоўнымі калектывамі падначаленых або залежных арганізацый[50]

---

[43] Гл. https://spring96.org/be/news/114311 і https://spring96.org/be/news/114443
[44] Напрыклад, кандыдаты ў дэпутаты Клімавіцкага раённага Савета дэпутатаў па Савецкай выбарчай акрузе № 10 Святлана Аляксеенка і Андрэй Дварэцкі https://www.rodniva.by/2024/02/izbirateli-klimovshhiny-prihodjat-na-vstrechi-s-kandidatami-v-deputaty.html
[45] Напрыклад, старшыня Гродзенскага абласнога выканкама Уладзімір Каранік выступаў на дыялогавай пляцоўцы па тэме выбарчай кампаніі ў Гродзенскім медуніверсітэце: https://spring96.org/be/news/113779
[46] Гл. першую справаздачу кампаніі "Сітуацыя перад выбарамі*2024" https://elections2024.spring96.org/be/news/113485
[47] Напрыклад, удзел у дыялогавай пляцоўцы кандыдатак у дэпутаты Алены Пасюты і Алены Клімовіч: https://spring96.org/be/news/114204
[48] Напрыклад, сустрэча намесніка пракурора Гродзенскай вобласці Андрэя Скурата, зарэгістраванага кандыдатаў у дэпутаты мясцовага савета па Ваўкавыскай выбарчай акрузе№ 3 з працоўнымі калектывамі ААТ "Беллакт" і ААТ "Ваўкавыскі мясакамбінат", якія ўваходзяць у тэрыторыю гэтай акругі:
[49] Напрыклад, сустрэча кандыдаткі ў дэпутаткі Палаты прадстаўнікоў Таццяны Лаўрыновіч з працоўнымі калектывамі "ДРБУ № 165", "Кобальт" і "Аўтапарк № 12": https://spring96.org/be/news/114349
[50] Напрыклад, сустрэчы з працоўнымі калектывамі кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Валерыя Малашкі: https://spring96.org/be/news/114255

і фактычна дадатковы эфірны час для кандыдатаў з ліку дзяржаўных служачых.[51]

## НАЗІРАЛЬНАЯ РАДА ПА СМІ

Як і ў папярэдніх кампаніях, пастановай ЦВК ад 21 лістапада 2023 г. № 36 была створаная Назіральная рада па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі (Назіральная рада).[52] Склад Рады (намеснік міністра інфармацыі, прадстаўнікі праўладнага Саюза журналістаў і праўладных СМІ), працэдура яе фармавання (персанальны склад зацвярджаецца ЦВК, незалежнасць якой па-ранейшаму выклікае пытанні)[53] і спынення паўнамоцтваў яе чальцоў[54] не дазваляюць казаць аб яе незалежнасці. Агульная рэпрэсіўная абстаноўка абумовіла немагчымасць трапіць незалежным прадстаўнікам журналісцкай супольнасці ў склад Рады, у адрозненне ад некаторых папярэдніх кампаній.[55] Назіральная рада заклікана кантраляваць выкананне рэдакцыямі СМІ ВК, Закона “Аб сродках масавай інфармацыі” ды іншых актаў заканадаўства, забеспячэнне роўных магчымасцяў для перадвыбарнай агітацыі, уключна з устанаўленнем рэдакцыямі СМІ, уладальнікамі інтэрнэт-рэсурсаў адзіных для ўсіх кандыдатаў памераў і ўмоў аплаты платформаў для агітацыі, а таксама разглядаць спрэчкі аб парушэннях парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў па зваротах кандыдатаў у дэпутаты, іх давераных асоб.[56] Пастанова прадугледжвае магчымасць прысутнічаць на пасяджэннях Назіральнай рады для чальцоў Цэнтральнай камісіі, работнікаў яе апарата ды “іншых асоб, запрошаных на пасяджэнне”.[57]

На момант падрыхтоўкі гэтай справаздачы інфармацыя аб дзейнасці Назіральнай рады адсутнічае.

[51] Напрыклад, удзел Аляксея Гарошкіна, кандыдата ў дэпутаты Магілёўскага абласнога савета дэпутатаў, і Аляксея Дз'ячэнкі, кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у тэлевізійнай праграме "В полный голос" дзяржаўнага тэлеканала "Беларусь-4": https://www.tvrmogilev.by/ru/projects-ru/viewRelease/821/
[52] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post36.pdf
[53] Гл. справаздачу кампаніі "Сітуацыя перад выбарамі*2024", с. 4, https://elections2024.spring96.org/be/news/113485
[54] Пастанова прадугледжвае, паміж іншым, недастаткова выразна сфармуляваную падставу "здзяйснення [чальцом Назіральнай рады] дзеянняў, якія перашкаджаюць працы Назіральнай рады альбо перавышаюць паўнамоцтвы яе чальца".
[55] Гл. справаздачу кампаніі назірання за выбарамі 2019 "Аналітычная справаздача па выніках назірання", с. 29, https://spring96.org/files/misc/final-spravazdacha-2019-01.bel.pdf
[56] п. 3, 4 Пастановы ЦВК №36
[57] п. 2 Пастановы ЦВК №36